№ 10 (747)
Сакавік 2019 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

У нумары:

Чытацкая рада: *Былі. Ёсць. Будзем?* – *стар. 2*

Выданне: *пра Астрамечава – ад Івана Панасюка* – *стар. 4*

Запавет: *«Калі мы зноў не занядбаем выхаванне любасці да роднага слова...»* – *стар. 5*

На тым тыдні...

✓**2 сакавіка** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці» адкрылася **выстаўка «Галоўны дакумент краіны: мінулае і сучаснасць (да 25-годдзя прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь)»**.

Выстаўка адлюстроўвае храналогію станаўлення канстытуцыйных асноваў у Беларусі і распавядае пра ход падрыхтоўкі і прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года і ўнясенне ў яе змяненняў і дапаўненняў у сувязі з палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі рэаліямі, якія імкліва змяняюцца.

✓**5 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася **часовая экспазіцыя «Легенды сонечнага каменя»** з фондаў Калінінградскага абласнога гісторыка-мастацкага музея (Расійская Федэрацыя).

Калініградская вобласць шырока вядомая як адно з найвялікшых радовішчаў бурштыну. Менавіта тут знаходзіцца каля 90 % сусветных бурштынавых запасаў. У Калінінградскім абласным гісторыка-мастацкім музеі захоўваецца каля 140 тысячаў прадметаў з прыродазнаўчых, археалагічных, гістарычных і мастацкіх калекцыяў.

Наведнікі выстаўкі могуць не толькі палюбавацца на прыгажосць бурштынавых рэчаў, але і набыць упрыгожанні для сябе і блізкіх: на часовай экспазіцыі дзейнічае выстаўка-продаж літоўскіх вырабаў з бурштыну.

Выстаўку можна наведаць да 5 чэрвеня.

✓**5 сакавіка** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці пачала працаваць **выстаўка «Рэканструяваныя строі народнага адзення жыхароў Віцебскага павета ў пачатку XX стагоддзя»** метадыста-майстра Віцебскага раённага цэнтра народных рамёстваў «Адраджэнне» Надзеі Гутнікавай. На выстаўцы прадстаўлена некалькі калекцыяў мужчынскіх і жаночых строяў, адноўленых па вырабах-арыгіналах з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і Краязнаўчага музея горада Вялікія Лукі.

Выстаўка працуе да 5 красавіка.

✓**6 сакавіка** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адкрылася **выстаўка калекцыйных лялек, мішак і клоўнаў «Больш, чым цацка»** з прыватнай калекцыі Ганны Страхавай.

Са старажытных часоў цацка выклікае ў дзяцей захапленне і выхоўвае іх. Для дарослых жа яна ператвараецца ў прадмет мастацтва, калекцыянавання і арыгінальны элемент інтэр'ера. Кожны майстар аддае часцінку сваёй душы, укладаючы яе ў па-дзіцячы наіўныя вочы лялькі.

У экспазіцыі прадстаўленыя калекцыйныя лялькі аўтарскай і фабрычнай вытворчасці з Германіі, Францыі, Швейцарыі, Іспаніі і ЗША 1960 – 2000-хх гг., якія запатрабаваныя сярод калекцыянераў і аматараў мастацтва па ўсім свеце.

✓**6 сакавіка** ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адбылася **прэзентацыя кнігі Юрыя Кур'яновіча «Старосветская Лошыца»**. Кніга з'яўляецца ўнікальным навукова-папулярным выданнем, што прысвечанае гісторыі Лошыцкага сядзібна-паркавага комплексу XVIII – XIX стагоддзяў, – аднаго з найбольш папулярных турыстычных аб'ектаў беларускай сталіцы. На сёння гэта адзіная кніга па гісторыі Лошыцкай сядзібы, лёс якой звязаны са шматлікімі імёнамі дзяржаўных і палітычных дзеячаў, навукоўцаў і пісьменнікаў. Гэта прадстаўнікі шляхецкіх родаў Друцкіх-Горскіх, Прушынскіх, сусветна вядомыя вучоныя Мікалай Вавілаў, Аляксей і Эма Сюбаравы, Анатоль Волузнеў, класік беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. У кнізе ўпершыню змешчаныя ўнікальныя архіўныя дакументы, у тым ліку невядомы рукапісны тэкст Янкі Купалы.

✓**8 – 10 сакавіка** ладзілася **вандроўка «Спадчына Вялікага Княства ва Украіне»** з гісторыкам і экскурсаводам Паўлам Каралёвым. Вандроўнікі мелі магчымасць наведаць уладанні князёў ВКЛ: два ўладанні Вітаўта Вялікага – Луцк і Крамянец, два замкі з музеямі князя Канстанціна Астрожскага – Астрог і Дубна, манастыр у Межырычы, заснаваны Астрожскім, адзіную на тэрыторыі сучаснай Украіны Радзівілаўскую ардынацыю ў ВКЛ – Алыку, а таксама Пачаеўскую лаўру.

Пад час вандроўкі адбыўся канцэрт старадаўняй музыкі ВКЛ, беларускіх спеваў, а таксама беларускіх перакладаў песняў народаў свету пад гуслі ў выкананні дуэта Алеся Чумакова («Стары Ольса») і Таццяны Ячнай («Апошні Шылінг»).

На фота Крысціны ПУЧЫНСКАЙ: замкі ў Луцку і Астрогу

Сябры! Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі. Будзьма разам!

Да ўвагі ўсіх, хто шануе свой край

Шаноўная грамада!

Неўзабаве споўніцца 16 гадоў, як грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры» распачало выдаваць штотыднёвік «Краязнаўчую газету». Выданне разлічанае на шырокае кола чытачоў, зацікаўленых айчыннай гісторыяй, глыбіннымі працэсамі станаўлення нашай дзяржаўнасці і культурнаасветнымі дасягненнямі беларускага народа. Аўдыторыя газеты – ад навучэнскай моладзі і да краязнаўцаў-аматараў сталага ўзросту. І ў розныя часы да кола чытачоў выдання, яе падпісчыкаў і аўтараў то далучаюцца новыя людзі, то адыходяць. На жаль, апошнім часам падпіска на газету рэзка скарачаецца. Гэткая тэндэнцыя характэрная для многіх папяровых выданняў, не толькі для нашага.

За мінулыя гады «Краязнаўчая газета» даказала сваё права на існаванне ў неабсяжным моры друкаваных выданняў краіны, не паўтараючы нікога з іх, маючы свой аўтарскі актыў і свайго чытача. Не лішне сказаць, што нашым агульным дасягненнем з'яўляецца тое, што на газету пастаянна падпісваецца большая частка раённых бібліятэк, музеяў, якія на прафесійнай аснове займаюцца краязнаўчай справай, папулярна даносяць ідэі радзімазнаўства да сваіх наведнікаў, рэгулярна выкарыстоўваючы для гэтых мэтаў матэрыялы, апублікаваныя ў нашай газеце. «Краязнаўчая газета» застаецца адзіным спецыялізаваным у сваёй галіне агульнанацыянальным выданнем.

Падпіскай на «Краязнаўчую газету» ахопленая большасць раёнаў Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцей. На жаль, шэраг раёнаў іншых абласцей амаль праігнаравалі «Краязнаўчую».

Не маючы так званага адміністратыўнага рэсурсу і будучы выданнем грамадскага аб'яднання, «Краязнаўчая газета» ў апошнія гады страціла амаль палову сваіх падпісчыкаў, што прывяло да высокіх датацыйных выдаткаў выдаўцом – Беларускім фондам культуры. Але за 16 гадоў не адбылося ніводнага выпадку нявыхаду газеты, яе рэдакцыя, якая складаецца з штатных супрацоўнікаў фонду, усе свае абавязкі выконвала перад падпісчыкамі бездакорна, нягледзячы на эканамічныя і фінансавыя калізіі. Таму кожны падпісны перыяд востра паўстае пытанне далейшага існавання адзінага ў краіне краязнаўчага выдання.

Прыйшоў час звярнуцца па дапамогу і парады да ўсіх, хто «быў, ёсць і будзе» разам з нашай агульнай «Краязнаўчай газетай». Неўзабаве пачнецца падпіска на газеты і часопісы на 2-е паўгоддзе 2019 года. Вынікі яе здольныя вызначыць далейшы лёс газеты, а разам з ёю лёс тых, хто на працягу 16 гадоў працаваў на карысць радзімазнаўства.

Калі раней у зваротах мы пыталіся ў кожнага, ці патрэбнае гэтае канкрэтнае выданне для вас, і прасілі падпісацца на наступны перыяд, а таксама па магчымасці параіць падпісацца сябрам і калегам, то цяпер пытанне, бадай, варта ставіць іначай:

калі кожны асабіста не падпішацца на газету, не паспрыяе пашырэнню падпіскі ў сваім рэгіёне, сярод калегаў па працы, сяброў па краязнаўстве, то адзіная «Краязнаўчая газета» з ліпеня 2019 года спыніць сваё існаванне. Ці задаволіць такая перспектыва кожнага з нашых чытачоў?

Гэтае пытанне ўжо абмеркаванае на сумесным пасяджэнні Выканкама ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыі «КГ», на якім прынятае адзінае рашэнне: звярнуцца з просьбаю да ўсіх, хто шануе свой край і з павагаю ставіцца да «Краязнаўчай газеты», дапамагчы ёй у гэты складаны час. Ваш актыўны ўдзел у арганізацыі падпіскі і магчымай матэрыяльнай дапамозе газеце дасць шанц, як гэта ўжо было і раней, адказаць на пастаўленае пытанне:

«Ці будзем мы разам?»

Нашы рэквізіты:

ОО «Белорусский фонд культуры», 220029, г. Минск, Троицкая наб., д. 6;

р/с BY81BLBB30150100081886001001, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк». Дирекция по г. Минску и Минской области, код BLBBBY2X, с пометкой «На "Краязнаўчую газету"», г. Минск, ул. Коллекторная, 11, УНП 100081886, ОКПО 37449864.

Выканкам ГА «Беларускі фонд культуры», рэдакцыя «Краязнаўчай газеты»

Апошні паварот «Кола года»

6 сакавіка ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася заключная імпрэза «Калядны аліўе» з шэрагу сустрэчаў, што ладзіліся ў рамках выстаўкі мастачкі Святланы Ветравай «Кола года», пра якую нашая газета ўжо пісала.

Удзельнікі першай, «вясновай» імпрэзы гукалі вясну разам з фальклорным гуртам «Горынь». Пад час «летняй» сустрэчы гісторык і рэканструктар Юрый Усціновіч знаёміў ахвочых з вайсковым майстэрствам Вялікага Княства Літоўскага. «Восеньская» імпрэза ператварылася ў майстар-клас па ткацтве ад С. Ветравай. «Зімовая» сустрэча была адметная святочнай варажбой, выступленнем Макса Івашына з аўтарскай музычнай праграмай, расповедам гісторыка кулінарыі Алены Мікульчык пра беларускую кухню эпохі Напалеона.

«Традыцыі народа – гэта карані дрэва, якія сілкуюць сучаснасць і будучыню. Без каранёў дрэва загіне. Свет развіваецца: мінулае і будучае ўзаемазвязаныя; нават там, дзе сувязь не відавочная, яна ёсць, і ўсе мы дзеці сваіх каранёў...», – такой філасофіі прытрымліваецца С. Ветрава.

Паводле інфармацыі арганізатараў
Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Двубой у музейным дворыку

Тчэм на кроснах

Журналіст з паэтычным ухілам

Нядаўна ў Ашмянскай раённай бібліятэцы зноў было шматлюдна. Клуб «Сустрэча» запрасіў ахвочых на чарговае пасяджэнне «Родны край, я цябе апяваю». На імпрэзу завітала астравецкая пісьменніца Ніна Рыбік, сябра творчых саюзаў пісьменнікаў і журналістаў, галоўны рэдактар газеты «Астравецкая праўда».

На сустрэчу з паэткай прыйшлі людзі розных узростаў, занятыя ў розных сферах дзейнасці, але аб'яднаныя цікавасцю да літаратурнага слова. Амаль усе творы Ніны Аляксееўны прысвечаныя цудоўнаму і непаўторнаму Хойніцкаму краю, што на Гомельшчыне. Яна аўтар кніг прозы «Свае і чужыя», «Права на адсяленне», «Скрыжаванні», яе творы ўвайшлі ў калектыўны зборнік «Астравецкай зямлі галасы», друкаваліся ў газеце «Ашмянскі веснік». Ёсць у пісьменніцы некалькі вершаў і нават казак для дарослых. Паспрабавала сябе Н. Рыбік таксама як драматург і нават актрыса. Пастаноўку «Калядны вечар» пабачылі не толькі ў нашай краіне, але прадстаўлялі яе ў Санкт-Пецярбургу. Удзельнікі вечарыны пачулі ўрывак з казкі і некалькі вершаў.

Вядучая пасяджэння – аўтар гэтых радкоў – расказала аб узнагародах, дыпломах і граматах, якімі ўганараваная госця. Яна лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх літаратурных прэміяў, пераможца рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года – 2017», Чалавек года Гродзеншчыны. Ніна Аляксееўна шчыра і пранікнёна расказвала пра сябе, пра свой край і родную вёску Уласы, што на Гомельшчыне, пра сваю працу галоўным рэдактарам газеты «Астравецкая праўда».

На завяршэнне сустрэчы слухачы выказалі словы ўдзячнасці, уручылі кветкі і сувеніры. А Ніна Аляксееўна падаравала бібліятэцы некалькі сваіх выданняў.

Святлана ТАЛІНСКАЯ, загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Ашмянскай раённай бібліятэкі

Ніна Рыбік (справа) распавядае пра свае творы

Нашы спачуванні

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» выказваюць шчырыя спачуванні дырэктару Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ляшковіч Алене Раманаўне з нагоды заўчаснай смерці бацькі.

Фотафакт

2 сакавіка ва ўнутраным двары Мірскага замка было шумна і весела. На нейкі час ён стаў тэатралізаванай пляцоўкай, на якой выступалі творчыя калектывы Карэліччыны і суседніх раёнаў. Са сцэны гучалі песні, пацешкі і прымаўкі. Шматлікія гледачы змаглі прыняць удзел у масленічных забавах, гульнях і конкурсах, пакаштаваць духмяны сімвал Масленіцы – бліны, прыгатаваныя тут жа. Працавалі выстаўкі-продажы вырабаў народных майстроў, шматлікія фотазоны, тэматычныя пляцоўкі.

Аксана ЯНУШ, тэкст і фота

Калекцыянерам, і не толькі

Старажытныя беларускія шахматы

Белпошта выпусціла ў абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «Археалогія» з выявамі старажытных шахматных фігураў XI – XIV стагоддзяў, знойдзеных пад час раскопак на тэрыторыі Беларусі. На марцы **№ 1283** выяўленыя слон і ферзь, на марцы **№ 1284** – слон, ладдзя і пешка.

Дызайн распрацавала Алена Мядзведзь. Памер абедзвюх марак, якія маюць форму трохкутніка, – 40,3 х 40,3 х 57 мм. Надрукаваныя аркушамі па 8 марак, памер аркуша – 109 х 109 мм. Наклад марак па 60 тыс. асобнікаў, надрукаваныя ў Бабруйскай узбуйненай друкарні імя А.Ц. Непагодзіна. Таксама А. Мядзведзь стварыла спецштэмпель і канверт з выявай шахматных фігураў. Праект быў падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь і Беларускай федэрацыяй шахматаў.

У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 г. Мінска адбылося спецгашэнне на канверце «Першы дзень».



Дзякуем за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялаў рубрыкі супрацоўнікам выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта»

Афганскае рэха на Любаншчыне

Ужо тры дзясяцігоддзі аддзяляюць нас ад даты вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Аднак і да гэтага часу мы яшчэ мала ўяўляем сабе маштабы трагедыі той неаб'яўленай вайны, калі нашыя юнакі былі вырваныя з мірнага жыцця і адпраўленыя ў далёкую краіну.

Каб захаваць павагу да ветэранаў, герояў той вайны, у Рэдкавіцкай сельскай бібліятэцы прайшла сустрэча «Афганістан баліць у нашых душах». У госці быў запрошаны ветэран той вайны наш паважаны зямляк Віктар Нізкі, а таксама настаўнікі і вучні мясцовай школы.

Распачала сустрэчу настаўніца гісторыі Святлана Дзікун, якая прыгадала, што Афганская вайна доўжылася 9 гадоў, 1 месяц і 19 дзён – удвая даўжэй, чым Вялікая Айчынная вайна. Праз афганскае пекла прайшоў мільён савецкіх салдатаў, у тым ліку 30 тысячаў беларусаў, і 770 нашых хлопцаў вярнуліся дадому ў цынкавых трунах. Інтэрнацыяльны абавязак за межамі былога Саюза выконвалі 95 ураджэнцаў Любанскага раёна. Сямёра з іх загінулі.

В. Нізкі нарадзіўся 18 сакавіка 1968 г. у шматдзетнай сям'і ў Рэдкавічах. Закончыўшы 10 класаў, паспеў папрацаваць некалькі месяцаў у калгасе. Паўналецце Віктара прыйшлося на час, калі ў Афганістане ішлі баявыя дзеянні. Пра тое, што можа патрапіць у Афганістан, хлопец стараўся не думаць. Толькі маці Нона Апанасаўна быццам штосьці прадчувала, бо горка плакала, не хацела адпускаць з абдымкаў, калі сын ад'язджаў у Любанскі ваенкамат.

Потым прысутныя сцішана слухалі аповед Віктара Аляксандравіча пра ўжо далёкія жахлівыя падзеі вайны. Апынуўшыся 10 лістапада 1986 г. у вучэбнай часці Ашхабада, юнак зразумеў, што яго чакае служба ў Афганістане, але пачуцця страху чамусьці не было. Праз пяць месяцаў вучэбкі падраздзяленне, дзе служыў В. Нізкі, самалётам адправілі ў Кабул. Шмат незвычайнага было на той далёкай зямлі. Гарачыня ў гарах стаяла больш за 50 градусаў, каскі на галовах награваліся, як патэльні, а калі дзьмуў вецер, на адлегласці выцягнутай рукі нічога не было бачна.

Віктар Нізкі

Баявое хрышчэнне наш зямляк атрымаў на трэці ж дзень, калі іх лагер душманы абстралялі з гранатамётаў. Было страшна, вельмі хацелася выжыць, убачыць родную хату, бацькоў. Потым, у ліхаманцы бою, страх кудысьці знік, а на змену яму прыйшла спакойная развага. Напэўна, служба ў вучэбнай часці навучыла канцэнтраваць волю і розум салдата.

Падраздзяленне, дзе служыў наш зямляк, перакінулі ў правінцыю Газні, В. Нізкі стаў служыць на БТР-80. Тут небяспека падпільноўвала штодзённа, бо каля крутых пясчаных дарог расла густая вінаградная лаза (яе называлі «зялёнкай»), дзе добра было хавацца душманам, якія ў любы момант маглі пачаць страляніну.

Апошні дзень на чужой зямлі Віктар Аляксандравіч памятае як сёння. Камандзір часці папярэдзіў, каб ніякіх феерверкаў і страляніны не было, але хлопец радаваўся, што годна выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак. Аднак служба ў арміі працягвалася яшчэ больш за паўгода шафёрам на Камчатцы. У кастрычніку 1989 г. В. Нізкі быў звольнены ў запас.

Вярнуўся сяржант у родную вёску Рэдкавічы з нагрудным знакам «Выдатнік Савецкай Арміі» і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», да якіх пазней дадаваліся і юбілейныя медалі. Але наш зямляк кажа, што ніякія ўзнагароды не змогуць засланіць трывожныя ўспаміны, адагнаць змрочныя сны, вярнуць назад бесклапотнае юнацтва. На жаль, не ва ўсіх яго сяброў пасля Афганістана добра склалася далейшае жыццё, некаторыя моцна хварэюць.

Віктар Аляксандравіч апошнія дзесяць гадоў жыве ў Рэдкавічах, працуе ў мясцовай кацельні качагарам, мае клапатлівую гаспадыню Таццяну, дваіх дзяцей і лічыць сябе шчаслівым чалавекам.

Напрыканцы сустрэчы прагучалі вершы афганскай тэматыкі Рыгора Сакалоўскага, якія пранікнёна прачыталі старшакласнікі Дзмітрый Ашуйка, Аляксандра Кулага, Ілья Кійко, Маргарыта Мігура, Мікіта Ашуйка.

Хочацца спадзявацца, што гэтая імпрэза паспрыяе выхаванню ў моладзі любові да сваёй Радзімы, павагі да яе гістарычнага мінулага, грамадзянскай свядомасці і патрыятызму. Такія па-сяброўску шчырыя сустрэчы з паважанымі землякамі звязваюць, зближаюць пакаленні, вучаць моладзь цаніць і берагчы мір.

Марыя СЛІВЕЦ, бібліятэкар Рэдкавіцкай сельскай бібліятэкі Любанскага раёна

Конкурс «Адвечнае»

Радзіны ў Пятровіцкім краі

Вельмі важнай падзеяй, што адлюстроўвае ўнутрысямейныя стасункі, з'яўляецца нараджэнне дзіцяці. Аднак радзінны абрад мала вывучаны, мала запісана і радзільных песень, якія гучалі ад нараджэння да хрышчэння дзіцяці. Старажытныя песні, як сцвярджаюць этнографы, увогуле ў цэнтральнай частцы Беларусі сустрэць немагчыма. Аднак некалькі такіх архаічных напеваў памятае жыхарка вёскі Узбарогі Пятровіцкага краю (Смалявіцкі раён) Марыя Каліта.

Марыя Рыгораўна адзначае, што, як бы цяжка ні жылося сям'і, з'яўлення на свет новага чалавека чакалі з радасцю. Спачатку да парадзіхі пасля родаў без запрашэння прыходзілі замужнія жанчыны – суседкі, сваячкі, сяброўкі. Яны прыносілі гасцінцы, размаўлялі, давалі парады па доглядзе нованароджанага. У той час многія жанчыны нараджалі дома без медыцынскай дапамогі, аднак потым іх маглі адправіць у Смалявічы, калі што-небудзь было не так. Тры вечары запар дзіця прыходзіла купаць пажылая жанчына – баба. Спявалі такую песню :

А хто, хто ды па ночы ходзіць?
А хто, хто ды бабулю просіць?
– Бабулька, ідзі да мяне,
К маёй жане.
У маёй жаны жыватачак баліць,
Хоча яна дачку (сына) радзіць.
– Не бойся, унучак, не бойся,
Дасць Бог гадзінкі,
Будуць радзінкі,
Дасць Бог часінкі,
Да будуць хрэсбінкі...

Праз некалькі тыдняў пасля нараджэння дзіцяці адбываліся хрэсьбіны. Раніцай кум і кума вазілі нованароджанага ў царкву хрысціць, а вярнуўшыся, перадавалі дзіця бацькам. У Пятровічах пасля вайны вазілі хрысціць у Мінск, Волму або ў Ляды. Потым савецкія ўлады гэта забаранілі, за хрышчэнне дзіцяці маглі сур'ёзна пакараць.

Галоўнымі дзеючымі асобамі на хрэсьбінах былі бабка, кум і кума. Бабуля гатавала традыцыйную «бабіну кашу». За святочным сталом бабу, кума і куму садзілі побач на покуці як шаноўных гасцей. Для кума і кумы, бабкі спявалі песні, іх адорвалі падарункамі. Затым выкуплялі і дзялілі «бабіну кашу» – страву з грэчневых, ячных ці прасяных крупаў з дабаўленнем масла і малака. Зверху каша аздаблялася цукеркамі. Дзяльба кашы суправаджалася жартамі, пэўнымі дзеяннямі, якія мусілі спрыяць здароўю і дабрабыту дзіцяці і яго бацькоў. Калі кашай пачаставалі ўсіх, талерку з-пад яе разбівалі, а чарапкі клалі бацькам дзіцяці на галовы, каб было болей дзяцей. Потым спявалі, танцавалі пад гармонік. Калі пачыналі збірацца дамоў, то бабу садзілі ў каляску, а ўзімку – у санкі і везлі яе, каб яна яшчэ што-небудзь купіла:

Наша баба, наша бабачка
Любачка, дый павозку любіць.
Завязем яе ў карчомачку,
Хай гарэлкі купіць!

Тое ж спявалі для кума і кумы. А яшчэ гучала такая песня:

– Пара табе, бабачка,
Дый дадому ісці.
– Дайце мне кіёчак,
У рукі піражочак,
Я й дадому ды пайду.

Вось гэтую песню спявалі, калі бабуля атрымлівала падарунак:

– Ці ведаеш, бабка, ці ведаеш, любка,
А за што намётку ўзяла?
Ці хадзіла часта, ці насіла смачна
Ты ўнучцы сваёй?
– Я хадзіла, хадзіла часта, я насіла смачна
Ды ўнучцы сваёй.
Я забіла парася ды ўнучцы сваёй,
Я хадзіла харашо ды к унучцы сваёй,
Я насіла блінцы ды ўнучцы сваёй,
Каб раджала сынка ды ўнучка мая.
Я насіла клёцкі, каб раджала дачку
Ды ўнучка мая.

Цяпер ужо не так усё праходзіць, моладзь не ведае ні песень, прысвечаных галоўным падзеям у жыцці, ні як ладзіць гэтыя падзеі. Ды і сам абрад страціў свой магічны сэнс і толькі знешне нагадвае колішні. Аднак веданне абраду дапамагае больш глыбока спазнаць мінулае і задумацца над днём сённяшнім.

Таццяна АПАЦКАЯ,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ № 43 г. Мінска
Алена ПРОЦЬКА,
Пятровіцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна

Творчасць сяброў Літаратурна-творчага аб'яднання «БУКет» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Малая Радзіма — высокія пачуцці

Любоў ДАНІЛЕНКА

***

Паводле фотаздымкаў фоталетапісіцы беларускай вёскі Наталіі Дораш

Чароўнае святло вясковага вакна,
Жыву я без цябе здаўна…
Ды дзе б ні бліснула святлом яно,
Смуткуе сэрца: «Роднае маё,
Тваё святло са мною ўначы,
Тваё цяпло на дне маёй душы.
Якую цемру ні сустрэла б я –
Са мной святло бацькоўскага вакна.
Якую на шляху ні стрэну сцюжу –
Тваім цяплом я сагравацца мушу,
Ў якую далеч я ні забяруся –
Я да цябе, бацькоўскае акно, ізноў вярнуся!
Ты мой маяк і ўдзень, і ў сне,
Ты толькі не сумуй там, без мяне…»

Выданні краязнаўцаў краіны

Маё жыццё і Астрамечава маё…

Вядомы краязнаўца і літаратар Іван Панасюк выпусціў у брэсцкім выдавецтве «Альтэрнатыва» кнігу «От Остромечино до Остромечево» накладам 500 асобнікаў. Выданне вылучаецца якасным афармленнем, мноствам каляровых ілюстрацыяў, у тым ліку з сямейных і асабістых архіваў, з альманаха «Астрамечаўскі рукапіс» ды інш. Аўтар выказвае падзяку за дапамогу ў выданні кнігі найперш ААТ «Астрамечава» і яго дырэктару Алегу Бураку.

Першую кнігу пра родную вёску пад назвай «Остромечево и остромычивци» Іван Аляксеевіч выпусціў у тым жа выдавецтве ў 2010 г. Але частка матэрыялаў у яе не ўвайшла, а многія трапіліся аўтару пазней, таму ўсе гэтыя гады ішла праца над новым выданнем. У 2016 г., да 500-годдзя Астрамечава, І. Панасюк выпусціў накладам 50 асобнікаў невялікую кнігу «Наша ридна остромыцька мова».

У сёлетнім выданні першая з пяці частак прысвечаная сучаснаму Астрамечаву і яго аграрнай гаспадарцы, заснаванай 70 гадоў таму як калгас «Памяць Ільіча». Другую частку складаюць шматлікія ўспаміны мясцовых жыхароў і ўраджэнцаў, вытрымкі з публікацыяў у друку, энцыклапедыяў ды іншых кніг, архіўныя дакументы (упершыню Астрамечына згадваецца ў студзені 1516 г. у Кнізе судовых спраў). Трэцяя частка распавядае пра ўладальнікаў сяла з 1650 па 1939 г. і іх сваяцкія сувязі (найперш пра княжацкія дынастыі Пузынаў і Сузінаў, таксама пра Швыкоўскіх, Ільінічаў, Нямцэвічаў). Шмат якія матэрыялы перадаў аўтару нашчадак адной з дынастыяў Юзаф Анджэй Пузына з Польшчы. Чацвёртая частка – пра Свята-Міхайлаўскую царкву, якая будавалася некалькі разоў: у 1650 г., 1720 г., 1840 г. Згаданы і музычны помнік XVII стагоддзя – нотны «Астрамечаўскі рукапіс».



Пятая частка носіць найбольш асабісты характар, пра што сведчыць і яе назва: «Жыццё маё, ці ж ты прыснілася мне?» Іван Аляксеевіч распавядае пра сваё дзяцінства і юнацтва ў Астрамечаве (ён нарадзіўся ў 1947 г. на хутары Лыпкы), пра пакаленні свайго радаводу, пра багатую гісторыю Астрамечаўскай школы. З 18 гадоў Іван Аляксеевіч жыве ў Лунінецкім раёне і працуе ў вясковых школах у Велуце і Бродніцы, школе-інтэрнаце і СШ № 2 у райцэнтры. Педагог, краязнаўца, фотамастак, аўтар каля 20 кніг цяпер на адпачынку, але працягвае творчую працу і, як бачым, не парывае сувязяў з родным Астрамечавам.

Вадзім ЖЫЛКО

«Калі мы зноў не занядбаем выхаванне любасці да роднага слова...»

Нядаўна на філалагічным факультэце БДУ зладзілі імпрэзу ў гонар 90-годдзя з дня нараджэння вядомага змагара за беларушчыну, адданага сына Бацькаўшчыны, прафесара філалогіі, выдатнага вучонага, крытыка, літаратуразнаўца Дзмітрыя Бугаёва. Арганізатаркай мерапрыемства выступіла дачка вучонага – доктар філалагічных навук Людміла Сінькова, якая запрасіла шматлікіх гасцей. Сваімі ўспамінамі пра калегу падзяліліся колішнія вучні, аспіранты, калегі: прафесар Вячаслаў Рагойша, дэкан філалагічнага факультэта, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Роўда, доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Шамякіна ды іншыя. Цікава было паслухаць не толькі аб прафесійнай дзейнасці навукоўца, але і пра яго цвёрды характар, упэўненасць і прыроджаную інтэлігентнасць. Пад час сустрэчы дэманстраваліся фотаздымкі з хатняга архіва, што нагадалі аб дзяцінстве будучага вучонага, сямейным шчасці, універсітэцкіх буднях, паездках з пісьменнікамі...

Лёс будучага вучонага звязаны з Магілёўшчынай, дзе ў невялічкай вёсачцы Губіншчына (паводле некаторых звестак – Сычык) у сялянскай сям'і нарадзіўся будучы аксакал беларускага літаратуразнаўства. Вучыўся ён у беларускамоўнай школе, якая, паводле яго ўспамінаў, «была размешчана наводшыбе ад вёскі, на ладнай горцы пры ўпадзенні кароценькай і, мусіць, таму безыменнай рачулкі ў Воўчас. Тады наша школа выглядала папраўдзе зухавата. Выкладанне ўсіх прадметаў, за выключэннем, вядома, рускай мовы і літаратуры, вялося на роднай мове. І нам гэта падабалася». Дзмітрыю Якаўлевічу давялося шмат зведаць, прабіваючы сабе скрозь кручастыя дарогі лёсу адну-адзіную сцяжынку ў жыцці.

Відаць, адсюль такая трываласць духу, такая непахіснасць у выбары ўласнага

Дзмітрый Бугаёў

шляху, у змаганні за сваё, роднае, у тым ліку за родную матчыну мову. Нездарма на імпрэзе не раз паўтаралася, што сучаснай моладзі неабходна браць прыклад з гэтага чалавека. Сёння ж мы ўсё часцей бачым адваротную сітуацыю, калі людзі не маюць пэўнага, свайго, погляду на многія рэчы, не ўмеюць адстойваць сваё меркаванне. Між тым, аказваецца, выжывае праўда. Д. Бугаёву бліскуча і дыпламатычна гэта ўдавалася.

Напрыклад, у далёкім 1967 годзе Бугаёву з рэзкай крытыкай давялося выступаць супраць занядбанасці беларускага слова, «якая ўжо тады была відавочнай, хоць афіцыйна сцвярджалася, што ўлады на ўсіх узроўнях дужа клапоцяцца пра развіццё нацыянальных моў у савецкай краіне, у тым ліку мовы беларускай. Але на самой справе яе становішча было незайздросным. Роднае слова не шанавалі і ў БДУ. Бо тут, – пісаў літаратуразнавец, – выкладанне вялося па-руску нават на беларускім аддзяленні філфака, дзе па-беларуску чыталіся толькі курсы роднай мовы і літаратуры».

Яшчэ адну спробу публічнай абароны нашай мовы Бугаёў зрабіў у перабудовачныя (так званыя гарбачоўскія) часы. Было гэта ў 1988 годзе ў Мінскім гаркаме партыі. Тэкст выступлення навуковец неаднаразова спрабаваў надрукаваць у СМІ, але нейкія акалічнасці ўвесь час перашкаджалі. Хоць тады ён і не замахваўся на галоўныя асновы бальшавіцкай палітыкі і ўвогуле не спрабаваў пярэчыць тагачаснаму ідэалагічнаму рэчышчу. Вось як успамінаў вучоны: «Перада мною выступала настаўніца, выкладчыца беларускай мовы, дарэчы, наша выпускніца, і казала, што родная мова ў нас зведзена да становішча замежнай. Гэта не зусім так. На самой справе беларуская мова ў нас у рэспубліцы знаходзіцца ў горшым становішчы, чым замежная».

Дзмітрый Якаўлевіч быў катэгарычна супраць абрання для абавязковага вывучэння толькі адной мовы як асноўнай – рускай або беларускай. Ён лічыў, што менавіта з гэтага і пачаліся «галоўныя беды нашай мовы, тое, што яна стала больш актыўна выцясняцца з розных сфер ужытку, траціць свой важны грамадскі статус». Д. Бугаёў ніколі не скідваў з рахунку віну кожнага ў занядбанасці роднай мовы. Яму часта даводзілася чуць, што гэта адбываецца з аб'ектыўных прычынаў, маўляў, так склалася гістарычна. Але ж літаратуразнавец і на гэта знаходзіў свой трапны адказ, прыводзячы дасціпныя словы Якуба Коласа: «На ўсё ёсць прычына». І гэтую прычыну навуковец бачыў яшчэ і ў «людской пасіўнасці ды перастраховачнасці, а яны, – пісаў Бугаёў, – тыя пасіўнасць і перастраховачнасць, таксама абумоўлены многімі прычынамі, у тым ліку масавымі рэпрэсіямі культаўскіх часоў, рэпрэсіямі, якія бязлітасна вынішчалі цэлыя пакаленні нацыянальнай інтэлігенцыі, бо тады многім заўзятым барацьбітам з нацыянальнай культурай нацыяналізм мроіўся ледзь не ў кожным беларускім слове, у самой павазе да ўсяго беларускага, свайго, роднага».

Вячаслаў Рагойша

Крытык прызываў не баяцца абвінавачанняў у нацыяналізме, бо, на яго думку, гэта не тое, што завецца любоўю да ўсяго роднага, краю, народа, мовы. Ён лічыў, што пагардлівасць у стаўленні да іншых народаў менш за ўсё ўласцівая беларусам, а наадварот, ім «найбольш шкодзіць нацыянальны нігілізм, прыніжэнне сваёй нацыі, непавага да саміх сябе».

Асабліва ярка ўспамінаў навуковец адну паездку ў Пінск на жнівеньскую педагагічную нараду 1987 года. Два дні слухаў настаўніцкія выступленні, што пераважна былі па-руску. І раптам у залу ўвайшлі малодшыя школьнікі, якія загаварылі па-беларуску. «З энтузіязмам, натхненнем, задзірыстай галасістасцю і з малой колькасцю пагрэшнасцяў супроць норм літаратурнага вымаўлення. Загаварылі з непрыдуманай любасцю, захопленасцю, жывым чалавечым хваляваннем», – успамінаў Д. Бугаёў. І ён зразумеў, што будучыня нашай мовы ў беларусаў як народа, як нацыі ёсць, калі мы зноў не занядбаем выхаванне любасці да роднага слова, не будзем процідзейнічаць гэтаму, як рабілася спрадвеку, а зробім усё, каб з маленства прышчэпліваць культуру патрыятызму, павагу да свайго народа і да народаў-братоў, да ўсёй вялікай чалавечай супольнасці.



Іван Роўда разам з дачкой Дзмітрыя Бугаёва – Людмілай Сіньковай

Няхай гэтыя ўспаміны пра выдатнага беларускага вучонага (я скарыстала тут матэрыялы з кнігі Д. Бугаёва «Жыццём ідучы», 2013 г.) натхняюць кожнага, хто неабыякавы да беларускай мовы, літаратуры і ўвогуле да роднага нашага краю.

Надзея ЗУЕВА

У Іркуцку гаварылі пра Лышчынскага

Іркуцкая гарадская грамадская арганізацыя «Крывічы» 1 сакавіка запрашала ўсіх ахвочых на пасяджэнне літаратурна-гістарычнага гуртка «Беларускія мысліцелі». Гэтым разам актыў клуба «Крывічы» знаёміў удзельнікаў гуртка з філосафам Казімірам Лышчынскім (1634 – 1689). Ён нарадзіўся ў маёнтку Лышчыцы на Брэстчыне, паходзіў са старажытнага шляхецкага роду ўласнага герба «Корчак». К. Лышчынскі глыбока вывучаў філасофію, гісторыю, прыродазнаўства, напісаў некалькі навуковых трактатаў. Прытрымліваўся меркавання, што прырода развіваецца сама па сабе, па сваіх законах, без удзелу Бога. За свае погляды быў абезгалоўлены, яго цела было спаленае на вогнішчы. Пра ўсё гэта і пра іншыя дэталі жыцця К. Лышчынскага ішла гаворка на пасяджэнні літаратурна-гістарычнага гуртка.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Удзельнікі і арганізатары імпрэзы

Паэзія Адама Міцкевіча ў творчасці Станіслава Манюшкі

Калі нарадзіўся Станіслаў Манюшка, Адаму Міцкевічу мінула дваццаць гадоў. Ён заканчваў навучанне ў Віленскім універсітэце і неўзабаве заняў месца настаўніка лацінскай мовы ў Ковенскай гімназіі. За адзінаццаць гадоў, што падвялі Станіслава да вучобы ў гімназіі, у жыцці Міцкевіча адбылося шмат падзеяў і пераменаў: ён выдаў у Вільні кнігу «Балады і рамансы», якая звеставала нараджэнне рамантызму ў літаратуры Беларусі і Польшчы, напісаў так званыя віленска-ковенскія «Дзяды» (часткі II і IV), паэму «Гражына. Літоўская аповесць» і «гістарычную аповесць» «Конрад Валенрод», апублікаваў зборнікі «Санеты» і «Крымскія санеты». У 1824 – 1828 гадах адбываў пакаранне за палкую мару аб свабодзе свайго краю выгнаннем у Расію, а з 1829 года апынуўся ў эміграцыі, якая разлучыла яго з радзімай, і там ён стварыў галоўны твор жыцця – эпічную паэму «Пан Тадэвуш».

Улетку 1858 года, пасля паспяховай прэм'еры чатырохактавай рэдакцыі оперы «Галька» ў Вялікім тэатры ў Варшаве, што адбылася 1 студзеня, Манюшка прыехаў у Парыж, абраны Міцкевічам для эміграцкага прытулку. Ішоў ужо трэці год, як вялікага сына Наваградчыны не стала: 26 лістапада 1855 года ён памёр у Канстанцінопалі, а ў студзені 1856 года яго прах быў перавезены і пахаваны на могілках Манмарансі ў Парыжы (а ў 1890 годзе перапахаваны ў Кракаве).

Таленавітым землякам, ураджэнцу Наваградчыны і ўраджэнцу Міншчыны, не суджана было сустрэцца, мець між сабою стасункі. І ўсё ж яны не размінуліся – у творчасці. С. Манюшка напісаў больш за 30 твораў на тэксты А. Міцкевіча, як ніводзін з тых кампазітараў свету, якія пісалі музыку на словы геніяльнага паэта. Міцкевіч быў аўтарам, з вершаў якога Манюшка пачаў сваю рамансава-песенную творчасць. Міцкевічавы вершы «Сон», «Няўпэўненасць» і «Пяшчотка», напісаныя ў 1825 годзе ў Адэсе, малады кампазітар паклаў на музыку ў 1837 годзе, а ў наступным выдаў іх пад назваю «Тры песні» ў Берліне, дзе вучыўся ў рэктара Пеўчай акадэміі К.Ф. Рунгенхагена.

Ці быў знаёмы з гэтымі выданнямі Міцкевіч, цяжка сказаць, але рамансы і песні Манюшкі на свае вершы, напісаныя не пазней сярэдзіны пяцідзясятых гадоў, паэт, несумненна, ведаў, бо асобныя сшыткі «Хатніх спеўнікаў», якія пачалі выходзіць у Вільні ў 1843 годзе, дасылала ў Парыж сястра Міцкевічавай жонкі Цаліны Гелена. Пра гэта сведчыць перапіска Цаліны і Гелены, дачок вядомай піяністкі Марыі Шыманоўскай, якая першай з прафесійных музыкантаў звярнулася да вершаў Міцкевіча. 19 чэрвеня 1851 года Цаліна ў лісце да Гелены, якая была замужам за Францішкам Малеўскім, філаматам, студэнцкім сябрам Міцкевіча, пісала: «Папрашу цябе, мая Гелена, ці не змагла б ты атрымаць аркушык для майго альбома ад нашага вялікага маэстра Манюшкі? Спевы, якія ты нам прыслала, – гэта цудоўныя творы... Як жа я табе зайздрошчу, што ведаеш яго, Адам з захапленнем слухае яго кампазіцыі».

У парыжскім салончыку Міцкевічаў раз, а то і два на тыдзень ладзіліся музычныя вечарыны, на якіх заўсёды было месца для твораў М. Шыманоўскай і С. Манюшкі. На гэтых вечарынах звычайна музіцыравала і спявала Цаліна, Адам жа толькі слухаў, бо, як сведчыць К. Лібельт, «голас меў як кура». Старэйшая дачка паэта Марыя Гарэцкая прыгадвала: «Бацька музыку любіў так, што нават сам пару кавалкаў склаў.., хоць сам увогуле не граў, а тое, што сабе напаўголаса часам напяваў, нельга было назваць спевам».

Але вернемся да «супрацоўніцтва» Манюшкі з Міцкевічам. Яно дало багаты плён. Манюшка яшчэ ў дзяцінстве зразумеў веліч і значнасць творцы і асобы Міцкевіча. Таму з такой пільнай увагай ставіўся да творчай спадчыны «ліцвінскага Дантэ». Як вядома, паэты рамантычнай плыні, арыентуючыся на народныя ўзоры, імкнуліся ствараць вершы-песні, нават друкавалі свае паэтычныя зборнікі пад назваю «Песні». Не быў выключэннем і А. Міцкевіч, які назваў свой першы друкаваны зборнік «Балады і рамансы». Паэт свядома трымаўся эстэтычных крытэрыяў рамантызму і лічыў неабходнай умоваю вершаскладання – меладыйнасць. Як быццам на заўвагу Міцкевіча, якая прагучала ў яго лекцыі 15 лютага 1842 года ў Калеж дэ Франс: «Што ж ёсць лірычная паэзія

Адам Міцкевіч

без музыкі? Чаго вартыя паэты, якія, нібыта спяваючы, не толькі не складаюць музыкі да сваіх песень, але ўвогуле не чуюць яе ў сабе? Музыка ў лірычных творах – гэта... галоўная, істотная частка паэзіі, яна з'яўляецца яе душою, жыццём, светам», Манюшка адгукнуўся стварэннем дзясяткаў музычных увасабленняў Міцкевічавых вершаў. Погляд яго сягаў перш за ўсё ў глыбіні, дзе ён знаходзіў водгалас свайму адчуванню і разуменню Радзімы, яе мінулага і сучаснага, гераічнага і лірычнага, велічнага і трагічнага...

Любоў да паэзіі Міцкевіча Манюшка выявіў між іншым і тым, што асобныя вершы («Размова», «Знаеш той край») увасобіў у дзвюх рэдакцыях, як бы імкнучыся пашырыць не толькі кола слухачоў, але і выканаўцаў, – параўнанне рэдакцыяў прыводзіць да такой высновы; і тым, што прапаноўваў сваім вучням менавіта Міцкевічавы вершы для напісання рамансаў, у прыватнасці, віленскаму вучню – Цэзару Кюі...

Уявім сабе, што сустрэча Манюшкі з Міцкевічам усё ж адбылася. Бясспрэчна, размова між імі кранулася б сумеснага праекта. Што могло з'явіцца ў выніку іх супрацоўніцтва? Хутчэй за ўсё, опера, – вядома, што Міцкевіч быў прыхільны да гэтага жанру. А Манюшка, працуючы з Міцкевічавымі вершамі, са свайго боку, свядома ці міжволі, імкнуўся да ўзбуйнення музычных формаў. Некаторыя з твораў, асабліва кантаты «Пані Твардоўская» і «Прывіды» і нават балада «Свіцязянка» відавочна набліжаныя да опернага жанру. «Вілія» і «Песня з вежы» – рамансы паводле эпізодаў з «Конрада Валенрода» – ніяк не назавеш творамі для хатняга выканання. Гэта хутчэй закончаныя эпізоды твора буйной формы, над якім, магчыма, працаваў кампазітар. Не напісаўшы на сюжэты Міцкевіча ніводнай оперы, Манюшка ў оперы «Страшны двор» выкарыстаў асобныя сюжэтныя фрагменты «Пана Тадэвуша».

«У Заходняй Еўропе рамантычная музыка развівалася "са спазненнем" у параўнанні з літаратурай, на беларускіх жа землях гэты працэс праходзіў практычна сінхронна», – слушна заўважае кандыдат мастацтвазнаўства Вольга Савіцкая ў сваёй працы, прысвечанай сімфанічнай творчасці Манюшкі. Асвоіўшы пад час вучобы ў Берліне вышэйшыя дасягненні нямецка-аўстрыйскай музычнай балады (найперш творы Карла Лёве і Франца Шуберта), Манюшка амаль адразу пасля сваіх першых рамансаў 1837 года піша ў 1839 годзе «Тры Будрысы» (магчыма, як перайманне балады Карла Лёве на той самы верш, бо рытмічнае супадзенне вакальных партыяў пачатку абодвух твораў нельга не заўважыць), а ў 1841-м – «Свіцязянку».


У. Глазаў у ролі Мечніка з оперы «Страшны двор»

Прытым адразу ж выводзіць жанр балады на якасна новы ўзровень. Па сутнасці – гэта паэмы з выразна акрэсленым сімфанічным прынцыпам развіцця музычнага матэрыялу. Кампазітар і сам гэта адчуў, бо з цягам часу дзве з пяці сваіх баладаў – «Тры Будрысы» і «Ваявода» – ён аркестраваў. Фактура акампанементу рэдакцыі для сімфанічнага аркестра істотна адрозніваецца ад фактуры фартэпіяннай рэдакцыі. У аркестравай рэдакцыі гэтыя творы набылі выгляд вакальна-сімфанічных паэмаў – жанру, які шырока распаўсюдзіўся толькі ў XX стагоддзі.

Праблематыка балады «Вяртанне бацькі» асацыятыўна нагадвае евангельскую падзею з апошняй часіны зямнога жыцця Ісуса Хрыста. «Свіцязянка» і «Рыбка», кожная па-свойму, сцвярджаюць немінучасць пакарання за здраду каханню. І разам з тым здрада мужу ў баладзе «Ваявода» апраўдваецца і паэтам, і кампазітарам, бо перамога кахання – перамога сапраўднай маральнасці.

Толькі на пачатку балады «Тры Будрысы» згадваюцца падзеі цяжкага збройнага змагання Вялікага Княства Літоўскага за незалежнасць краіны з іншаземнымі захопнікамі. А па сутнасці, гаворка ідзе зноў жа пра каханне, што як маральная каштоўнасць вышэйшая за багацце. Шляхецкае светаўяўленне яскрава ўвасабленае ў такіх рамансах, як «Пяшчотка», «Размова» і іншых. Гарэзлівыя дзяўчаткі і адданыя сваім каханым хлапчукі («Зося», «Паніч і дзяўчына», «Перш яе ўспаміны») малююцца так шчыра, такімі мяккімі інтанацыямі гумару, што выклікаюць зычлівую ўсмешку.

Не толькі беларускія тапанімічныя назвы (Свіцязь, Вілія, Нёман), следам за паэтам, пакінуў нам кампазітар у мастацкую памяць пра тутэйшыя рэаліі. Беларускасць у гэтых творах выяўленая як праз творчае асэнсаванне фальклорных запазычанняў («Свіцязянка», «Рыбка»), так і праз найбагацейшыя крыніцы мелодыяў роднага краю.

Глыбока ўспрынятую тугу па Радзіме вялікага паэта Міцкевіча Манюшка выразна перадаў у кантаце «Крымскія санеты», рамансах «Песня з вежы», «Да Нёмна», «Знаеш той край» – рамансе-шэдэўры ў вакальнай літаратуры XIX стагоддзя. Гэта творы і на вершы Міцкевіча, і пра лёс Міцкевіча.

Цікавасць С. Манюшкі да творчасці А. Міцкевіча не згасала цягам усяго жыцця кампазітара. З паэзіі Міцкевіча Манюшка пачынаў свой шлях у мастацтва, з паэзіі Міцкевіча пачаў стварэнне беспрэцэдэнтнага сярод славянскіх (і не толькі) кампазітараў праекта «Хатніх спеўнікаў». Апошні, шосты, зборнік – з тых, што складаў яшчэ ён сам, грунтаваўся толькі на вершах Міцкевіча.

Віктар СКОРАБАГАТАЎ,
Уладзімір МАРХЕЛЬ,
Ганна КАРЖАНЕЎСКАЯ

Князева пячатка

Ішлі восеньскія дні, правеяныя вятрамі і пралітыя дажджамі. Вада збіралася ў ручаінкі ды порстка бегла ў нізіны. У ручаінак ішла свая праца, бо прамыіны свідравалі глебу, сягалі самога пяску, які блішчэў мноствам дзівосных каменьчыкаў.

Такім часам аднаго ранку бег сабе хлапчына Мікітка берагам возера, каб падзівіцца, ці ёсць там ужо рыбакі. Шпарка бег, таму і паслізнуўся на адной з прамыінаў, праточанай восеньскай ручаінкай, ды ляснуўся з усяго маху надта балюча. Хацеў ужо заенчыць з болю, але вока яго прыцягнуў зялёны кружочак, што ляжаў на прамытым бліскучым пяску, – Мікітка забыўся пра боль і крыўду на шкодную ручаінку, падняў кружочак ды паклаў на далонь. Абрадаваўся са свае знаходкі ды пабег дадому да дзеда, каб пахваліцца і распытаць, што за яна.

Прыбег Мікітка дадому, а дзеда не застаў – той толькі пакінуў на стале запіску для ўнука, што пайшоў у краму па соль і запалкі. Хлапчына крыху засмуціўся, бо не мог адразу ні з кім падзяліцца радасцю знаходкі, акрамя коткі, якая круцілася каля яго ног і задаволена мурчэла. Але хіба ж яна магла зразумець Мікіткава захапленне? Вядома, не.

Хлапчына падышоў да стала ды паклаў зялёны кружочак на чысты аркуш паперы, што ляжаў побач з запіскай. Вырашыў чакаць дзеда, каб развязаць усе пытанні разам. Кружочак быў мокры – па краях яго на паперы праступіла вільгаць. Мікітка заўважыў гэта і вырашыў перакласці кружочак на лаву, каб не псаваць добры аркуш, патрэбны для школьнай навукі. Тут хлапчына заўважыў, што на тым месцы, дзе ляжала яго знаходка, застаўся след: на паперы адбілася выява вершніка, які ўздымаў над сабой меч ды імчаў кудысь на кані. Мікітка загледзеўся на той след і вельмі здзівіўся – вершнік і яго конь пачалі рухацца, нібыта жывыя. Тое ж было толькі паловай дзіва,

бо на чыстым аркушы паперы пачалі з'яўляцца літары, якія збягаліся ў словы, чуўся гук, бы то драпае пёрка, але не было відаць рукі, што гэта чыніла. Страшна стала хлапчыне – хацеў адбегчы, каб схавацца за печ, але цікаўнасць перамагла. І ён пачаў чытаць, бо добра ўжо складаў словы ў сказы. А ўгледзеў Мікітка такое: «З Божае Ласкі вялікі князь літоўскі і кароль польскі вітае нашчадка гонару слаўных продкаў». Праз якія імгненні ўнізе аркуша, дзе нядаўна ляжаў зялёны кружочак, з'явіўся подпіс: «Жыгімонт II Аўгуст».

Здзіўленню Мікіткаваму не было мяжы. Тут хлапчына пачуў дзедавы крокі ў сенцах і шпарка пабег туды, каб пра ўсё яму найхутчэй распавесці, а галоўнае – паказаць. Мікітка схапіў дзеда за руку ды пацягнуў за сабой да стала. Вось яны ўжо і перад аркушам, але папера яго – чыста-белая, быццам і не было на ёй ані следу літараў. А на лаве ляжаў загадкавы зялёны кружочак – маўклівая таямніца.

Ігар КАНДРАТОВІЧ

Так кажуць на Рагачоўшчыне

Не хваліся, ідучы на кірмаш, а з кірмашу.

У сабакі вочы пазычыў.

Не мыльсь, галіцца не будзеш.

Так цяжка працаваў, што ледзь не ажарабіўся.

Укляпаўся (абазнаўся).

Еш, хоць распержыся!

Ай, плюнь ды разатры!

Хоць хамут без лямца, затое дуга з кальцом.

Стары кажа на глум, а ты бяры на вум.

Адзін з'еш хоць і вала – адна хвала.

Які целеш – такі і клін, які бацька – такі і сын.

Павывучваліся – цяпер падавай ім залатое стула!

Не поп – не апранайся ў рызу!

Зніціўся, як свіны татка.

Каму гадка, а дзіцяці – матка.

Які куст, такі і парастак.

З авадня, ды штодня.

Ходзіць, як парадзіха.

Дзе гора ні хадзіла, а да вахлака нанач.

Калі ляха поўху, дык каб і па другому.

Зімой старой бабе і на печы холадна.

На ёй кожа брэша.

Які пашыўся, такі і падзярэцца.

Пад усе бочкі шпунт.

Запісаў Міхась СЛІВА

(Працяг будзе)

Літаратурныя сустрэчы на Савецкай

У Бярозаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы пачаў дзейнічаць краязнаўчы праект «Літаратурныя сустрэчы на Савецкай», у рамках якога да Міжнароднага дня роднай мовы была падрыхтаваная літаратурна-музычная праграма «Пішу для Вас з асалодай і радасцю». Аматары беларускай паэзіі, вучні школаў горада віталі маладых таленавітых паэтак Бярозаўшчыны – Алёну Папко і Алену Казловіч-Усцілоўскую. Пра іх прысутным расказалі вядучыя імпрэзы – загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі Святлана Гунік і бібліятэкар Таццяна Хінько.

Першыя творы А. Папко пабачылі свет у раённай газеце «Маяк», пазней паэтка друкавалася ў абласной газеце «Зара», газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць» і «Нёман»; яе вершы былі змешчаныя ў калектыўным зборніку паэзіі і прозы «ЛітАўра». Пяшчотай і любоўю да родных мясцінаў, сваёй мовы, людзей насычаныя творы Алёны Мікалаеўны:

А далягляд імжыць
над цішынёю
Сунічнай. І ніколі
не збяднець,
Калі палі красуюць
збажыною,
Калі ўзыход спяшае
ружавець.

У жыцці А. Папко спалучаюцца настаўніцкія клопаты і літаратурная творчасць. З 2015 года маладая паэтка – член Саюза пісьменнікаў Беларусі. «Лунаць бясстрашна ў вышыні – мне досыць слова...» – так называлася электронная прэзентацыя па матывах творчасці А. Папко, якую прадэманстравалі прысутным супрацоўнікі бібліятэкі. Сама паэтка распавядала пра вытокі сваёй творчасці, узгадала цікавых людзей, з якімі звяло жыццё. Алёне Мікалаеўне пашчасціла на пачатку свайго шляху ў літаратуру сустрэцца з Маргарытай Гаравой, якая вядзе літаратурную старонку «Крыніца» ў раённай газеце. Маргарыта Іванаўна заўсёды падбадзёрыць, натхніць, калі творчыя сілы на спадзе.

«Мая мара імкнецца далёка да зоркаў...» – радок з верша А. Казловіч-Усцілоўскай стаў назваю электроннай прэзентацыі па творчасці паэткі. Бярозаўшчына, дзе шмат гадоў Алена Юр'еўна працуе настаўніцай, натхніла яе на лірычныя, філасофскія вершы:

Сівая даўніна,
Цябе я не зракуся,
Калі зракуцца нават
камяні.
Калі і жураўлі
Ляцець сюды не будуць,
Аблюбаваўшы цёплае
жытло.
Была і застаюся
беларускай,
І ты маё,
А я тваё
Жыццё.

Яе вершы публікуюцца ў «Зары», «Полымі», «ЛіМе», «Чырвонай змене», «Бярозцы», польскім часопісе «Люблін». Паэтка перакладае на беларускую мову творы польскіх аўтараў. Яе асобныя творы пакладзеныя на музыку кампазітарам Валянцінай Бурміставай – так з'явіліся песні «Вуліцы Мінска» і «Краіна маленства». На сустрэчы ў бібліятэцы прагучала песня «Бярозаўскі вальс», словы да якой напісала наша паэтка, музыку – Алена Говін. Гэтая песня стала гімнам Бярозы.

Пад час імпрэзы вершы А. Папко і А. Казловіч-Усцілоўскай пра родны край, мову, каханне, маці, прыроду чыталі ў музычным суправаджэнні бібліятэкары Ала Кумпель, Аляксандра Логіс, Таццяна Воран. Выступіла Галіна Халімончык, настаўніца А. Казловіч-Усцілоўскай, якая распавядала пра першыя крокі ў літаратуру сваёй выхаванкі.

Пад час сустрэчы адбыўся змястоўны дыялог паміж слухачамі і творцамі. Даўніла імпрэзу кніжная выстаўка «Пачуцці светлыя паэзія кранае...», дзе былі прадстаўленыя творы нашых таленавітых землякоў.

Спадзяемся, што сустрэча з маладымі творцамі паспрыяе выхаванню павагі да роднай мовы, цікавасці да моўнага багацця нашага народа. Сёння як ніколі трэба берагчы нашую мілагучную, спеўную мову, пранесці яе праз стагоддзі і перадаць нашчадкам.

Святлана ГУНІК,
загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі Бярозаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Сакавік

17 – Забела Уладзімір Паўлавіч (1939), рэжысёр, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982) – 80 гадоў з дня нараджэння.

17 – Кароткая Ларыса Лявонцьеўна (1919, Мінскі р-н – 2012), літаратуразнаўца, педагог – 100 гадоў з дня нараджэння.

17 – Шкраба Рыгор Васільевіч (1919, Салігорскі р-н – 1997), крытык, літаратуразнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

18 – Гальперына Юдзіф Самойлаўна (1914, Мазыр – 1984), беларуская і руская актрыса, заслужаная артыстка Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння.

18 – Палікарповіч Канстанцін Міхайлавіч (1889, Касцюковіцкі р-н – 1963), вучоны ў галіне археалогіі, які адкрыў і вывучаў стаянкі першабытных людзей эпохі палеаліту і мезаліту на тэрыторыі Беларусі і Бранскай вобласці Расіі, – 130 гадоў з дня нараджэння.

18 – Стаповіч (Стэповіч) Альбін Мацвеевіч (1894, Астравецкі р-н – 1934), грамадска-палітычны і музычны дзеяч, публіцыст – 125 гадоў з дня нараджэння.

19 – Садзін Уладзімір Сцяпанавіч (1924 – 2010), беларускі графік, жывапісец, заслужаны работнік культуры Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння.

19 – Самцэвіч Васіль Андрэевіч (1889, Крупскі р-н – 1973), педагог, краязнаўца, заслужаны настаўнік Беларусі – 130 гадоў з дня нараджэння.

19 – Свентахоўскі Пётр Уладзіміравіч (1939, Камянецкі р-н – 2006), жывапісец, педагог, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2000) – 80 гадоў з дня нараджэння.

19 – Смольскі Браніслаў Сільвестравіч (1909, Мінск – 2005), беларускі музыказнаўца, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

20 – Іофе Эмануіл Рыгоравіч (1939), вучоны-гісторык, палітолаг, сацыёлаг, культуролаг, педагог, даследчык беларускай гістарыяграфіі, гісторыі навукі і культуры, гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

20 – Мікола Мятліцкі (Мікалай Міхайлавіч; 1954, Хойніцкі р-н), беларускі паэт, перакладчык, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола (1986), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1998), Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2013) – 65 гадоў з дня нараджэння.

«Агу-у, вясна!»
«Гаў-гаў – вясна...»

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

ПІНА́КЛЬ (франц. pinacle) – дэкаратыўныя вежачкі, слупкі на контрфорсах (часам і на інш. архітэктурных частках). Пінаклі звычайна завяршаюцца фіяламі і ўпрыгожваюцца крабамі (дэталь у выглядзе скульптурных стылізаваных лістоў і кветак). Пінакль вядомы ў еўрапейскай архітэктуры познараманскага і гатычнага стыляў (саборы ў Рэймсе, Францыя; Кёльне, ФРГ, і інш.). У беларускай архітэктуры пашырыліся ў канцы XIX – пачатку XX ст. у збудаваннях несапраўднай готыкі (касцёлы ў вв. Гервяты Астравецкага, Нарач Мядзельскага, капліца ў в. Закозель Драгічынскага раёнаў і інш.). У архітэктуры 1950-х гг. пінаклі шырока выкарыстоўваліся ў мастацкім аздабленні жылых і грамадскіх будынкаў. Былі дэкаратыўным завяршэннем парапетаў і балюстрадаў (жылыя дамы на вул. Кірава ў Віцебску, Першамайскай у Магілёве, на праспекце Незалежнасці і на Прывакзальнай плошчы ў Мінску і інш.).

Пінаклі на будынку касцёла ў в. Гервяты Астравецкага раёна

ПІНСК – горад, цэнтр Пінскага раёна, у сутоках рэк Піна і Прыпяць. За 175 км ад Брэста. Чыгуначная станцыя на лініі Брэст – Лунінец, вузел аўтамабільных дарог на Іванава, Івацэвічы, Лунінец, Столін, рачны порт. Пінск (летапісны Пинеск, Пиньск) упершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1097 г.

Аб паходжанні гідроніма Піна адназначнага меркавання няма: на думку географа В. Жучкевіча, ён утварыўся ад славянскай асновы «пін», сэнсавае значэнне якой – прыпынак, прыстань, вір у рацэ, гаць. Існуюць таксама і іншыя тэорыі, найбольш пашыраныя з якіх: «Піна» ад «пена», што пляскалася на ўзбярэжжы; «Піна» ад лацінскага «пінус» – «сасна», бо сосны ў вялікай колькасці раслі на берагах ракі.

Паводле археалагічных даследаванняў, гарадзішча старажытнага Пінска размяшчалася на левым узвышаным беразе р. Піна. Уключала дзядзінец плошчаю больш за 1,5 га, вакольны горад і гарадскі пасад. Жыхары займаліся земляробствам, паляваннем, рыбалоўствам і рамёствамі. Ёсць сведчанне пра пашыраныя гандлёвыя сувязі з Валынню, Кіевам, Паўночным Прычарнамор'ем. Да паловы XII ст. у складзе Турава-Пінскага княства, кіраваўся тураўскімі князямі. У 1132 г. вялікі князь Яраполк Уладзіміравіч далучыў Пінск разам з Туравам да Мінскага княства. З 1157 г. у самастойным удзельным Тураўскім княстве. У 2-й палове XII ст. пінскі ўдзел выдзеліўся ў самастойнае княства, першым яго князем стаў Яраслаў Юр'евіч, заснавальнік лініі пінскіх князёў Рурыкавічаў. У XII – XIII стст. Пінскае княства знаходзілася пад уплывам Уладзіміра-Валынскага і Кіеўскага княстваў. Пад 1263 г. у летапісе згадваецца Успенская праваслаўная царква (прадмесце Лешча), паводле падання, заснаваная яшчэ ў часы князя кіеўскага Уладзіміра.

Пасля мангола-татарскага нашэсця Тураў канчаткова страціў сваё значэнне і Пінск стаў цэнтрам эканамічнага і духоўнага жыцця Тураўскай зямлі. У XIII ст. утвораная Пінская праваслаўная епархія. З пачатку XIV ст. у складзе ВКЛ, у Троцкім ваяводстве. Юрый Нос, намеснік Вітаўта, на чале пінскага атрада браў удзел у Грунвальдскай бітве. У канцы XIV ст. Жыгімонт Кейстутавіч утварыў староства – буйны дзяржаўны маёнтак у ВКЛ. У 1396 г. пасяліў у Пінску францысканцаў і фундаваў для іх манастыр. У 1-й палове XVI ст. у Пінску 680 двароў, блізу 5 100 жыхароў, 27 вуліцаў, 4 брамы, гандлёвая плошча з крамамі; 17 праваслаўных храмаў (2 мураваныя), у т.л. 2 манастыры, касцёлы і кляштары францысканцаў і дамініканцаў (заснаваныя ў 1542). На месцы старажытнага дзядзінца размяшчаўся замак. Працавалі 177 рамеснікаў прыватных і замкавых, у т.л. 48 займаліся апрацоўкай металаў (кавалі, слесары, пушкары, залатары). На ўтрыманні замкавага «ўрада» жылі 2 пушкары (згадваецца знатны майстар зброі Васка Бакуновіч), дойліды Занко і П. Радзівонавіч, півавар, мернік. У Лешчанскім манастыры жыў вядомы летапісец манах Мітрафан. Там была вялікая бібліятэка рукапісных кніг, у т.л. Апостал XIV ст. на пергаменце.

Пячатка магістрата з гербам Пінска, XVII ст.

На пачатку XVI ст. складваецца яўрэйская абшчына. У 1566 г. Пінскае княства скасаванае. З 1569 г. Пінск стаў цэнтрам павета Берасцейскага ваяводства. У 1581 г. горад атрымаў магдэбургскае права і герб – у чырвоным полі залаты лук са стралой і нацягнутай цецівой. У канцы XVI ст. узнікла Пінска-Тураўская уніяцкая епархія. Тады ж узнікла пінскае богаяўленскае брацтва, у якое ўвайшлі члены гарадскога магістрата, рамеснікі, купцы. Былі адкрытыя школа, багадзельня. У 1614 г. намаганнямі шляхцянкі Яніны Макараўны Гарабурдзінай, жонкі слонімскага суддзі, на беразе Піны, за вонкавым валам замка, у дварышчы Полазаўскім, была пабудаваная Богаяўленская царква, узнік Богаяўленскі манастыр, пры якім дзейнічалі 2 пачатковыя школы, шпіталь, збіраліся сродкі на аднаўленне праваслаўных цэркваў. У вучылішчы выкладалі беларускую, лацінскую, грэчаскую і польскую мовы, 7 вольных мастацтваў. У 1633 г. стараста пінскі князь Альбрыхт Радзівіл пасяліў у Пінску езуітаў і пабудаваў для іх касцёл і калегіум, пры якім працавалі друкарня (з 1729 г.), аптэка.

(Працяг будзе)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 14.03.2019
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 136.
Тыраж 504 асобнікі.